**Літаратурна-музычная кампазіцыя «Паклон табе ад сэрца, мама!»**

**14 кастрычніка – Дзень Маці: сцэнарый свята**

**Н. М. Дуброўская,**
настаўнік беларускай мовы і літаратуры вышэйшай катэгорыі

**Ход мерапрыемства**

**Вядучы 1.** Мама… Маці… Матуля… Мамачка! Слова гэтае на ўсіх мовах свету гучыць падобна, бо цэлы свет змяшчае, бо з'яўляецца своеасаблівым паролем – немаўлятка становіцца чалавекам. Самай высокай ступенню чалавечых пакут і самай страшнай караю аказваецца асэнсаванае адмаўленне ад маці. Класік беларускай літаратуры Рыгор Барадулін сцвярджае ісціну, што Загады Божыя пішуцца ў сэрцы кожнага чалавека з самых першых хвілін жыцця. І пішуцца яны мамай, якая напаўняе святлом душы сваіх дзяцей.

Ад маці залежыць духоўнасць усёй сям'і: цеплыня, шчырасць і лад – усё ад яе і праз яе. Невыпадкова і свята маці супадае з вялікім народным і царкоўным святам – Пакровам.

Добрая Дзева Марыя стала Маці самога Бога. Яе жыццё на зямлі было нялёгкім. Ёй давялося шмат працаваць і пакутваць, хаваць немаўлятка ад смяротнай небяспекі, ратавацца з ім, калі ён хадзіў па гарадах, прапаведуючы слова Божае.

**Вядучы 2.** А які боль перанесла яна, калі сына абвінавацілі і няpraведна забілі. Усё перанесла яна са смірэннем, прысвяціўшы сябе служэннем Богу і людзям.

**Вядучы 1.** Яе жыццё для нас – прыклад. Мы павінны імкнуцца да Яе ў цярпенні, веры, любві да працы.

**Вядучы 2.** А ўсе нашы матулі, якія жадаюць вырасціць сваіх дзяцей добрымі, чэснымі, сумленнымі людзьмі, павінны маліцца ёй аб дапамозе ў нялёгкай працы выхавання сваіх чадаў.

*Гучыць песня «Беларусянятка»*

**Вядучы 1.** Маці – носьбіт народнай мудрасці і маралі, яна – носьбіт вечнасці і традыцый, звычаяў. Адносіны да маці, любоў і павага да яе – выключная мера духоўнасці кожнага чалавека.

**Вядучы 2.** Адносіны да жанчыны-маці – люстэрка любога грамадства. І мама, і родная мова звязваюць чалавека з той зямлёю, якую ён называе Радзімай.

***Дзеці чытаюць вершы.***

І тым заўсёды ганаруся,
Што ў шчаслівую пару
Я нарадзіўся ў Беларусі
І так, як мама, гавару.
Нам застаенцца ад матуль
І шчырасць іхняя,і ласка,
Наш лёс з няўмольнага адтуль
Не пераняць ім, як падпаска.

Такі закон прыроды – маці,
І ў ім ёсць сэнсу глыбіня:
Раней, чым першы смех дзіцяці,
Ты доўга чуеш плач штодня.

Ягоным смехам, словам, спевам
Пасля ўмудрэеш…А спярша –
Патрэбен плач, каб болем спелым
Магла напоўніцца душа.

І колькі ты жывеш на свеце
Спакон вякоў, здавён-даўна,
Ты сэрцам там,  дзе плачуць дзеці,
Бо дзеці слёз не льюць здарма.

Бо ім ці страшна, ці балюча,
Ці душыць крыўда  – не сцярпець.
Ад шчасця слёзы ў іх не льюцца,
Ад шчасця – хочацца ім пець.

Ты – маці, ты на ўсё гатова,
Усё – змагчы, усё – аддаць,
Адно б вясёлых ды здаровых
Дзяцей пад сонцам гадаваць.

Таму сабе ты ў долі просіш
Зусім не шмат, зусім не шмат:
Над галавою – неба просінь,
Ды ў дзецях лад, у дзецях – лад…

О, як ты радуешся светла,
Калі не зломкі, не злябы,
Яны жывуць беззапаветна
Дабром – без прыценю злабы!

Як пачуваешся шчасліва,
Калі не кволыя душой,
Яны шануюць клапатліва
Твае гады і гонар твой!

Гады ж баляць, гады цяжэюць.
А балючэй за ўсякі боль –
Як дзеці родныя чужэюць,
І варагуюць між сабой.

І ты глядзіш пакутна – скрушна:
Чаго вам, дзеткі, не стае,
Каб жыць па-брацку, згодна, дружна?
Усе ж вы –  родныя мае!

Я ўсіх пад сэрцам вас насіла,
І кожным гордая была,
І шчасця кожнаму прасіла,
І ў кожным род свой берагла.

О, так! У кожным прадаўжала
Свой род – не горшы між другіх.
І як не крыўдзіў лёс бывала,
Ніхто не бачыў слёз маіх!

І колькі доўжыцца тут вёснам,
Кругавароту зім і лет –
Прыгожы, казачна дзівосны
Дарыць  ты будзеш дзецям свет.

Што ў цэлым свеце, на планеце,
Ва ўсіх краях, ва ўсіх кутках –
З’яднае ўсе людскія сэрцы
Твой вобраз з дзіцем на руках!

Мы – тройчы дзеці ў вечным крузе:
Мы – дзеці роднае сям'і,
І дзеці Маці – Беларусі,
І дзеці Матухны-зямлі.

Трайны ён круг, ды недзялімы:
Хоць сёння – як не паглядзі –
І лёс дзяцей, і лёс Радзімы,
І лёс планеты – лёс адзін.

І усе мы разам у адказе
За гэты вечны круг жыцця.
Хвала ж таму, хто ў трудным часе
Без мітусні і без ныцця
Сваё праходзіць так, як мама.

**Вядучы 1.** А ты ведаеш, чый вобраз самы распаўсюджаны ў нашай літаратуры?

**Вядучы 2.** Ну, вядома ведаю, гэта вобраз маці. І гэта не дзіўна. Кожны чалавек мае ў сэрцы пачуццё ўдзячнасці, пашаны да сваёй маці. Але не кожны знаходзіць патрэбныя словы, смеласць, каб іх выказаць. Некаму перашкаджае сарамлівасць, нехта лічыць, што не да твару сур'ёзным дарослым людзям падобныя сантыменты.

**Вядучы 1.** А мы не саромеемся выказаць матулям словы ўдзячнасці.

А якія рукі самыя – самыя…
Рукі нашых матуль,
Якія і кормяць, і апранаюць, і прылашчаць.

Паклон табе ад сэрца, мама,
Ты без хлусні і без абмана
Трымала наш сямейны стан.

Даверам нас, дзяцей, расціла,
Бо знала ты, што й цэлы свет –
Адно дамовіўшыся шчыра
Пазбыцца зможа страшных бед.

І не чытаўшы мудрых кніжак,

Спасцігла ісціну сама:
Няма Радзімы ў злыдняў хіжых
І маці ў нелюдзяў няма.

Калі шчасце атуліць
Ці заціхну ў журбе,
Я заўсёды, матуля,
Успамінаю цябе.

І нясу, як закляцце,
Перад Богам віну,
Што цябе, мая маці,
Я пакінуў адну.

Ты мне родная самая
Па душы, па крыві,
Ты жыві, мая мама,
Доўга – доўга жыві.

Сярод тлуму людскога
І ў прыцішаным сне
Цісне сэрца трывога –
Як ты там без мяне?

Пасля ростані горкай,
Перажыўшы зіму,
На бацькоўскім падворку
Я цябе абдыму.
Больш ніколі спакусай
Зло мяне не кране,
Прад табой павінюся,
Як ніколі раней.

**Вядучы 1.** Пакуль жыве маці, мы ў любым узросце адчуваем сябе дзецьмі: ёсць каму скардзіцца, ёсць перад кім кволіцца.

**Вядучы 2.** Нездарма ў народзе кажуць: у каго матка, у таго галоўка гладка.

**Вядучы 1.** Дзякуй вам за жыццё, што ў цяжкую хвіліну побач, што разумееце і адчуваеце нас, за вашу любоў і ласку.

**Вядучы 2.** Будзьце заўсёды здаровыя! Давайце з пашанай і мілатой адносіцца да матуль, і доўгіх гадоў жыцця вам.

**Вядучы 2.** Любіце сваіх мам і не толькі ў свята выказвайце ім словы ўдзячнасці і любві.

**Вядучы 1.** Даруйце, дарагія, за нанесеныя крыўды, за непаслушэнства, за непаразуменне.

**Разам.** Мы вас любім!

***Па ходу сцэнарыя ўключыць канцэртныя нумары.***